**ДУК «Кобрынская раённая цэнтралізаваная бібліятэчная сістэма»**
**Аддзел бібліятэчнага маркетынгу**

# Хроніка
# культурнага жыцця бібліятэк г. Кобрына і раёна за лістапад 2023 г.

У рамках акцыі «Полезные каникулы» ў бібліятэках раёна прайшлі квест-гульні, конкурсы, віктарыны, пасяджэнні аматарскіх клубаў і шэраг іншых мерапыемстваў.

## Мерапрыемствы ў рамках Года гістарычнай памяці і раённага краязнаўчага месячніка « Чытаючы Радзімы старонкі »

**9 лістапада**

На літаратурна-мастацкай кампазіцыі «Непрыручаная ластаўка Палесся», прысвечанай 75-годдзю з дня нараджэння вабітнай беларускай паэткі Яўгеніі Янішчыц, студэнты Кобрынскага ДПТК гарталі старонкі біяграфіі паэткі, гаварылі аб незвычайным літаратурным таленце Яўгеніі Іосіфаўны Янішчыц, чыталі яе вершы. Мерапрыемства суправаджалася паказам відэапрэзентацыі «А ўсё таму, што родам з лістападу…».

ЦРБ, 34 чал.

**23 лістапада**

Адбылася краязнаўчая гадзіна «Сцяжынкамі родных традыцый» для навучэнцаў Кобрынскага дзяржаўнага палітэхнічнага каледжа, на якой прысутныя пазнаёміліся з касцюмам свацці в. Лелікава Кобрынскага раёна, які ў 2018 годзе, як элемент нематэрыяльнай культурнай спадчыны «Традыцыі вырабу і выкарыстання касцюма Лелікавай свахі» быў уключаны ў Дзяржаўны спіс гісторыка-культурных каштоўнасцей Рэспублікі Беларусь, ўдзельнічалі ў чытанні старадаўніх песень, заклічак. Мерапрыемства суправаджалася праглядам відэапрэзентацыі «Культурное наследие: традиции, обряды, праздники».

ЦРБ, 34 чал.

## Мерапрыемствы ў рамках акцыі «Всемирный день некурения»

**15 лістапада**

Урач па медыцынскай прафілактыцы Кобрынскай ЦРБ Святлана Васільева выступіла на уроке здороўя «Если хочешь долго жить – сигареты брось курить!», якое арганізавана ў рамках праекта «Здаровая моладзь – здаровая нацыя». Навучэнцы Кобрынскага ДПТК даведаліся аб таксічным уздзеянні кампанентаў тытунёвага дыму на здароўе чалавека, пазнаёміліся са статыстыкай смяротнасці ад курэння. Мерапрыемства суправаджалася паказам відэапрэзентацыі «Больше знаешь – меньше риск».

ЦРБ, 27 чал.

**21 лістапада**

На ўроке здароўя «Мифы и реальность о курении» бібліятэкар пазнаёміла прысутных з гісторыяй з'яўлення тытуню і цыгарэт, праінфармавала аб тым, колькі ў свеце пакутуе і гіне людзей ад гэтай згубнай звычкі, прывяла канкрэтныя факты пра шкоду курэння.

Філіял «Дзіцячая бібліятэка», 28 чал.

## Іншыя мерапрыемствы

**1 лістапада**

Бібліятэкары запрасілі старшага участковага інспектара ІСН Кобрынскага РАУС маёра міліцыі Андрэюка Сяргея Сяргеевіча на мультымедыйнае падарожжа «Я аб законе, закон пра мяне». Ён расказаў дзецям, якія яны маюць правы і абавязкі ў адпаведнасці з нормамі і правіламі, чаму неабходна весці здаровы лад жыцця. Дзеці адказвалі на пытанні віктарыны «Казачныя героі», прагледзелі відэаролік «Дзіцячая папраўчая калонія ў Беларусі», пазнаёміліся з кніжнай выставай «Мае правы, мае абавязкі».

Філіял «Дзівінская ПБ, 21 чал.

**3 лістапада**

На Дыялогавую пляцоўку па абмеркаванню праекта новай Канцэпцыі нацыянальнай бяспекі Рэспублікі Беларусью былі запрошаны навучэнцы ўстановы адукацыі «Кобрынскі дзяржаўны політэхнічны каледж». Перад прысутнымі выступілі госці мерапрыемтсва: Алена Віктараўна Мінгазава - адвакат, медыятар, загадчыца юрыдычнай кансультацыі Кобрынскага раёна; Наталля Вітальеўна Піваварава - адвакат юрыдычнай кансультацыі; Раман Васільевіч Мельнік - галоўны рэдактар раённай газеты «Кобрынскі веснік», старшыня раённага аддзялення беларускай партыі «Белая Русь», дэпутат Брэсцкага абласнога Савета дэпутатаў.

ЦРБ, 23 чал.

**9 лістапада**

Падчас правядзення урока мужнасці «Дзяцінства, абпаленае вайной» навучэнцы Кобрынскага ДПТК даведаліся аб гераізме дзяцей на вайне, прагледзелі мультымедыйную прэзентацыю «Дзеці вайны». Бібліятэкар Кобрынскага ДПТК Ірына Пракапюк пазнаёміла навучэнцаў са зборнікам артыкулаў «Карані і кроны», у якім апісваецца гісторыя Кобрыншчыны 30-60 гадоў XX ст., зачытала ўспаміны аб здзеках і зверскім знішчэнні дзяцей Дамачаўскага дзіцячага дома.

ЦРБ, 23 чал.

**15 лістапада**

У ЦРБ сабраліся сакратары пярвічных арганізацый ГА «БРСМ» устаноў адукацыі Кобрынскага раёна. Першы сакратар Брэсцкага абкома грамадскага аб'яднання «БРСМ» Юрый Сегенюк выступіў з дакладам «Развитие лидерских навыков у молодежи: открытие своего потенциала» Юрый Сяргеевіч адказаў на пытанні ўдзельнікаў, якія датычыліся маладзёжнай палітыкі, будаўніцтва патрыятычнага цэнтра і планаў БРСМ.

Удзельнікі прайшлі тэст на вызначэнне лідэрскіх якасцей, падзяліліся сваім меркаваннем аб рабоце ў сферы адукацыі, пазнаміліся з кніжнай выставай «Праз кнігу да міру і стварэнню»

ЦРБ, 35 чал.

**15 лістапада**

Падчас правядзення гістарычнага экскурса «И пусть поколения помнят» вядучыя распавялі пра Хатынь і іншыя спаленыя вёскі Беларусі. Вучні прагледзелі відэасюжэт «Сожжённые заживо – история белорусской деревни», урывак з мастацкага фільма «Иди и смотри», пазнаёміліся з кніжнай выставай «Памяць пра мінулае ў імя будучыні». Завяршылася мерапрыемства віртуальнай экскурсіяй «Хатынь – белорусская деревня, которой нет».

Філіял «Дзіцячая бібліятэка», 31 чал.

**16 лістапада**

У рамках патрыятычнага праекта «Беларусі роднай славутыя крокі» для навучэнцаў старэйшых класаў Пескаўскай СШ прайшла патрыятычная гадзіна «Маленькие солдаты большой войны». Патрыятычны час суправаджаўся паказам электроннай прэзентацыі «Дети – герои войны», праглядам кніжна-ілюстраванай выстаўкі-экспазіцыі «Праз кнігу – да міру і стварэнню» і аглядам кніг «Строки, опаленные войной».

Дзеці пазнаёміліся з выданнямі Генеральнай Пракуратуры Рэспублікі Беларусь, выпушчанымі па выніках расследаванняў, з кнігамі, якія расказваюць аб дзецях вайны, аб важнейшых мемарыяльных комплексах і помніках, якія захавалі пакуты і мужнасць жыхароў Беларусі ў гады Вялікай Айчыннай вайны. Завяршылася мерапрыемства экскурсіяй па бібліятэцы.

ЦРБ, 29 чал.

**17 лістапада**

У бібліятэцы прайшоў Дзень творчага планавання «Время строить планы: планирование 2024», удзельнікамі якога сталі бібліятэчныя работнікі горада і раёна. Прысутныя пазнаёміліся с асноўнымі момантамі планавання работы бібліятэк на 2024 год, з метадычнымі рэкамендацыямі па афармленню краязнаўчых работ у рамках раённага бібліятэчнага конкурсу «Імя ў летапісе малой радзімы», атрымалі кансультацыю па планаванню работы з фондамі і каталогамі.

ЦРБ, 26 чал.

Выканаўца Міхейкіна-Белякова А. М.
Тэл. 3 85 81